Резюме

С целью совершенствования методики оперативного контроля за технико-тактической деятельностью волейболистов было разработано 2 протокола педагогических наблюдений, характеризующие модельные, средние, максимальные и минимальные значения выполнения игровых приемов в каждой партии команды в целом и отдельными игроками в частности, что позволило оперативно вносить объективные коррективы в соревновательную деятельност спортсменов и учебно-тренировочный процесс.

Summary

For the reason improvements of the methods of the operative checking 2 protocols of the pedagogical observations were designed for technician-tactical activity volleyball players, characterizing model, average, maximum and minimum values of the execution playing acceptance in each parties of the command as a whole and separate player in particular that has allowed operative to contribute the objective corrections in competitive activity athlete and scholastic-burn-in process.

УДК 329 (476.6)

## ЯЎРЭЙСКІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ РУХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧ.XX СТ.

**В.В. Калюта**

УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы"

г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Працэс станаўлення яўрэйскага рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху на тэрыторыі Беларусі быў вельмі цесна звязаны з зараджэннем сіяніісцкага руху. У канцы XVIII ст. на тэрыторыі Германіі ўзнікае грамадскі рух сярод яўрэйскай інтэлігенцыі – Хаскала(іўрыт). Хутка распаўсюдзіўшыся па ўсей усходняй Еўропе ў XIX ст. ен ставіў перад сабой мэту аб'яднання традыцый іудаізма са свецкай адукаванасцю. У выніку актыўнай дзейнасці Хаскалы ў заходніх краінах, яўрэі атрымалі грамадзянскае раўнапраўе, асіміліраваліся і вызначаліся толькі вераспавяданем. У адрозненні ад Захада ў Расіі палітыка царызма ў 50-60 гг. XIX ст. была накіравана не на інтэграцыю яўрэяў у расійскае грамадства, а наадварот – на ізаляцыю іх і прывяла да радыкалізацыі яўрэйскіх мас. Расійскае яўрэйства, сярод якога вядучыя пазіцыі займалі яўрэі паўночна-заходніх губерняў, стала авангардам сусветнага сіяніісцкага руху. Актыўны ўдзел яўрэйскае насельніцтва прыняла і ў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

рэвалюцыйным руху ў паўночна-заходніх губернях, у якія ўваходзіла большая частка Беларусі.

На тэрыторыі Беларускіх губерняў у 2 паловеXIX ст. пражывала больш за 1 млн. яўрэяў. Сутнасць палітыкі рускага самадзяржаўя ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва можна вызначыць "як імкненне расійскага ўрада асіміліраваць усе нерускае насельніцтва імперыі, у тым ліку і яўрэяў". Аднак працэс асіміляцыі ў адносінах да яўрэяў не спрацоўваў з-за заканадаўча замацованага нераўнапраў'я яўрэйскага насельніцтва, якое адносілася да другога разраду інародцаў, правы якіх вызначаліся асобымі палажэннямі.[1] Расійскі ўрад усемі метадамі садзейнічаў пераходу яўрэяў усіх узростаў у хрысціянства. У 1884 г. пасля спразнення кагалаў, яўрэйскія абшчыны былі пазбаўлены статута юрыдычнай асобы. З 1870 г. яўрэі пачалі абмяжоўвацца ў праве паступлення на дзяржаўную службу. Са студзеня 1874 г. яўрэі не мелі права перавода ў афіцэрскія чыны.[2].

Супярэчлівая палітыка самадзяржаў'я ў адносінах да яўрэяў, рост рэвалюцыйнага руху ў краіне і забойства 1 сакавіка 1881 г. Аляксандра II народавольцамі, з якімі была звязана яўрэйка Геся Гельфан, яшчэ больш павялічыла юдафобію таго часу. Як вынік – моцная хваля яўрэйскіх пагромаў вясной-летам 1881 г. на поўдні Расіі. 3 мая 1882 адпаведна "Часовых правіл аб яўрэях" забаранялась пражыванне яўрэяў па-за гарадамі і мястэчкамі, а таксама ў мяжах 50-верстнай пагранічнай паласы [3]. Па гарадавому палажэнню 1892 г. яўрэі не дапускаліся да ўдзелу ў гарадскіх выбарах. Пачынаючы з 1887/88 вучэбнага года была ўстаноўлена працэнтная норма прыняцця яўрэяў ва ўніверсітэты і сярэднія навучальныя ўстановы: у мяжах рысы аселасці – 10%, па-за ей – 5%. Сістэма прававых абмежаваняў садзейнічала недапушчэнню яўрэяў да ўдзелу ў дзяржаўным і грамадска-палітычным жыцці расійскага грамадства, што стала бы пагрозай для ўстояў самадзяржаўя.

Вынікам заканадаўчай палітыкі самадзяржаўя , якая абмяжоўвала яўрэяў у выбары месца жыхарства, з'явілася і нераўнамернасць у пражыванні яўрэйскага насельніцтва. Гэта ў 80-гг.XIX ст. прывяло да значнай канцэнтрацыі іх у гарадах і мястэчках рысы аселасці. У 79 гарадах паўночна-заходняга краю, па статыстычным дадзеным на 1897 г., пражывала 622827 яўрэяў (43,79% ад агульнай колькасці гарадскога насельніцтва). У 481 мястэчках лічылася 533097 яўрэяў, ці 37,47%. У сельскай мясцовасці паўночна-заходняга рэгіену – 266 507 яўрэяў, ці 18,74%. У паўночна-заходніх губернях яўрэі складалі абсалютную большасць гарадскога насельніцтва. У Гродзенскай – 57,7%, Мінскай – 52,1%, Магілеўскай – 52,4%, Віцебскай – 52,1%.[4].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Ва ўсей Расійскай імперыі на канец XIX ст. гандлем займаліся каля 1,3 млн. чалавек, з якіх 36% складалі прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці.). У асноўным яны канцэнтраваліся ў 15 заходніх губернях яўрэйскай аседласці. Высокі працэнт яўрэйскіх гандляроў у паўночна-заходніх губернях складаў вялікую эканамічную канкурэнцыю паміж імі, з-за немагчымасці рэалізацыі прадукцыі па-за межамі вузкіх рамак мяцовага рынка збыта, абумоўліваючы бядотнае іх становішча і іх радыкалізацыю.

У прамысловасці, пры ўліку ўсіх занятых, на долю яўрэяў у Гродзенскай губерніі прыходзілася 62,3%, Мінскай – 63,4%, Віленскай – 51,3%, Магілеўскай – 51,5%, Віцебскай – 46,7%. [5]. Нягледзячы на дастатковыя высокія паказчыкі ўдзелу яўрэяў у прамысловай вытворчасці, існавала даволі вострая праблема яўрэйскага працаўладкавання і занятасці, што было звязана не толькі з іх вялікай колькасцю і, як вынік, узнікаючай канкурэнцыяй, але і з тэрытарыяльным размеркаваннем прамысловых прадпрыемстваў на тэрыторыі Беларусі, большасць з якіх у канцы XIX ст. знаходзілася па-за гарадамі. У сельскай мясцовасці размяшчалася большасць лесапільных, вінакурных, цэгляных, шкляных, папяровых фабрык і заводаў. [6]. Заканадаўчыя абмяжаванні ў праве жыхарства не дазвалялі яўрэям працаваць на прадпрыемствах сельскай мясцовасці. У паўночна-заходнім рэгіене Расійскай імперыі на лесапільных заводах, 63,3% якіх належала яўрэям, працавала усяго 18,3% яўрэйскіх рабочых.

У пачатку 80-гг. XIX ст. у асяродзі расійскага яўрэйства хуткімі тэмпамі распаўсюджваецца новая плынь сіяністкага руху. Сутнасць яе была ў адказе ад палітыкі асіміляцыі і пераходу да нацыянальнага вызвалення з канчатковай мэтай пабудовы нацыянальнай дзяржавы на тэрыторыі Палестыны. Узнікненне і распаўсюджванне на тэрыторыі расійскай імперыі палесцінафільскіх арганізацый стала асновай для ўспрыняцця яўрэйскімі масамі сіяністкіх ідэй герцліянскага толку. Этап станаўлення канцэпцыі "палітычнага" сіянізму Т. Герцля адносіцца да перыяду з 1897 па 1903 г. У 1897 г. адбыўся Першы сіяністкі кангрэс ў Базелі, які палажыў асновы Сусветнай сіяністкай арганізацыі. У выніку актыўнай дзейнасці сіяністаў к лету 1898 г. у Еўропе і ЗША існавалі 913 арганізацый, 373 з якіх дзейнічала на тэрыторыі Расіі. У 1900 г. у Беластоку былі пакладзены асновы сіяністкай арганізацыі ў Расіі. У пачатку XX ст. сіяністкія гурткі існавалі ў Гомелі, Мінску, Пінску, Сувалках, др. гарадах беларускіх губерняў. Трэба адзначыць, што з пачатку зараджэння "палітычнага" сіянізму тэрыторыя паўночна-заходніх губерняў стала эпіцэнтрам

гэтага руху. У 1902 г. у Мінску адбыўся другі з'езд сіяністаў Расіі, а ў 1906 г. на 3-м з'езде расійскіх сіяністаў г.Вільна быў абраны мейсцам існавання цэнтральнага камітэта расійскай сіяніскай арганізацыі. На пачатковай стадыі свайго развіцця "палітычны" сіянізм не ўяўляў пагрозы існуючаму ладу. Ен не прадугледжваў барацьбы за паляпшэнне сацыяльна-эканамічнага становішча яўрэйскага насельніцтва непасрэдна ў рамках Расійскай дзяржавы, што магло зблізіць яго з рэвалюцыйна-дэмакратычным рухам і выклікаць напружанасць з Расійскімі ўладамі. У перыяд 1900-1901 гг. у канцэпцыі палітычнага сіянізму адбываюцца істотныя змены. Пачынаючы з IV сіяніскага з'езду ў Лондане, на першы план у сіяніскім руху ўсе больш выходзяць пытанні агульнага паляпшэння становішча яўрэйскага насельніцтва ў краінах пражывання. У 1901 г. адбываюцца змены арганізацыйнага ўстава сіяніскага руху. У асновы яго быў пакладзены федэратыўны прынцып, які садзейнічаў узнікненню ў сіяніскім руху асобных партый. Змяшчэнне акцэнтаў у дзейнасці сіяніскіх арганізацый, якія ўтваралі перадумовы для ўдзелу яго ў рэвалюцыйным руху, вымусілі Расійскі ўрад прыняць цыркуляр ад 24.06.1905 г. аб забароне ўсякай сіяніскай дзейнасці акрамя той, якая накіравана на арганізацыю эміграцыі яўрэяў з Расіі. Дзеля вырашэння "сіяніскага" пытання Т. Герцэль меў перагаворы з міністрам унутраных спраў Расіі В.К.Плеве 8 і 13 жніўня 1903г., дзе яму была абяцана падтрымка сіяніскага руху на тэрыторыі Расіі, калі ен не будзе займацца ўнутранай палітыкай. 16 жніўня 1903г. Т.Герцэль сустрэўся з яўрэйскай грамадзкасцю беларускіх губерняў г.Вільна. Афіцыйныя колы Расіі бачылі ў сіянізме рэальны палітычны працівавагу сацыял-дэмакратычнаму Бунду.

Імкнучыся заваяваць падтрымку шырокіх кол яўрэйскага насельніцтва, сіяністы і бундаўцы вялі няспынную барацьбу. IV з'езд Бунда, які адбыўся ў маі 1901 г. аб'явіў "вайну" сіянізму. У сваю чаргу сіяністы напярэданні V кангрэса (26-29 снежня 1901 г.) забаранялі сіяністам дзейнічаць у арганізацыях, звязаных з Бундам. Адмаўляючы сіяніскі падыход вырашэння нацыянальнай праблемы, бундаўцы не мелі выразнай нацыянальнай праграмы. Удзел жа Бунда ў расійскім сацыял-дэмакратычным руху безумоўна ставіў іх у працівавагу існуючаму ладу.

У пачатку XX ст. у барацьбу за шырокія колы яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларускіх губерняў уключаецца яшчэ адзін з накірункаў сіяніскага руху – сіяніскі сацыялізм. Сіяністы-сацыялісты прызнавалі вядучую ролю яўрэйскага пралетарыяту ў сучаснай яўрэйскай гісторыі. Аднак у адрозненні ад Бунда, сіяністы-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

сацыялісты не ўспрымалі рэвалюцыю як метад сацыяльнай барацьбы. Сцвярджаючы, што яўрэйскі рабочы клас не змог пераўтварыцца ў мнагалікі пралетарыят з-за абмежавання яго ў сферы працаўладкавання на прамысловыя прадпрыемствы і перавагу ў ім мелкіх рамеснікаў і гандляроў, сіяністы-сацыялісты сцвярджалі аб адсутнасці глыбокай дыферэнцыяцыі і беспадстаўнасці класавай барацьбы сярод яўрэйскіх рабочых.

Сіянісцка-сацыялістычная ідэя сфарміравалася як альтэрнатыва "буржуазнай" сіянісцкай канцэпцыі Т. Герцля і змяшчала ў сабе ідэі сіянізма і ўтварэння яўрэйскай сацыялістычнай дзяржавы. Першая група "Паалей Цыен" на тэрыторыі Беларусі ўзнікла ў Мінску у канцы 90-х гг. XIX ст. У 1901-1902 арганізацыі сіяністаў-сацыялістаў "Паалей-Цыен" існавалі ў Бабруйску, Вільна, Віцебску, Дзвінску, Гомелі, Гродна. [7]. У перыяд 1901-1903 гг. адбываюцца спробы аб'яднання разрозненных груп "Паалей-Цыен" і стварэння самастойнай сіянісцкай рабочай партыі. Нягледзячы на хуткі рост перафярыйных арганізацый "Паалей-Цыен", паміж імі не было арганізацыйнага і ідэалагічнага адзінства. Адпаведна агентурным сведкам аб Гродзенскай арганізацыі "Паалей Цыен", у 1905 г. мясцовыя гурткі не мелі ніякіх адносін з арганізацыямі другіх гарадоў. Рост сацыяльнага і дзяржаўнага антысемітызма, сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс у Расійскай імперыі і яго абвастрэнне ў выніку руска-японскай вайны (1904-1905) і рускай рэвалюцыі (1905-1907), масавыя яўрэйскія пагромы, крызіс у сіянісцкім руху, смерць прэзідэнта ССА Т. Герцля ў 1904 г., сталі асноўнымі прычынамі радыкалізацыі сіянісцкага руху ў прачатку XX ст.

Далейшая эвалюцыя сіянісцкага сацыялізма знайшла свае адлюстраванне ў узнікненні і дзейнасці яўрэйскіх нацыянальных партый сацыял-дэмакратычнага накірунку : Яўрэйскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі "Паалей Цыен" (узнікла ў 1906г.), Сацыялістычнай яўрэйскай рабочай партыі (1906г.), Сіянісцка-сацыялістычнай рабочай партыі (1904-1905 гг.). Беларускія губерні і працягвалі заставацца арэнай актыўнай палітычнай дзейнасці сіянісцкага руху ва ўсіх сваіх накірунках.

Літаратура

1. Энгель В.В. «Еврейский вопрос» в русско-американских отношениях (На примере паспортного вопроса, 1864-1913 ).-М.: Наука, 1998.-С.36.
2. Гольденвейзер А.А. Правовое положение евреев в России //Книга о русском еврействе : от 1860-х годов до революции 1917г.- Иерусалим: гешарм; М.: РПО «Мосты культуры»; МН.ЮОО «Мет»,2002.-с.136.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

3. Гольденвейзер А.А. Правовое положенне евреев в России //Книга о русском еврействе : от 1860-х годов до революции 1917г.- Иерусалим: гешарм; М.: РПО «Мосты культуры»; МН.:000 «Мет»,2002.-с.127.
4. Лещинский Я. Еврейское население России и еврейский труд // Книга о русском еврействе от 1860-х годов до революции 1917 г.- Иерусалим: Гешарм; М.:РПО “Мосты культуры»;Мн.: 000 «Мет»,2002.-с.189.
5. Колеснева О.Еврейские рабочие Беларуси и законодательство российской империи конца XIX-начала XX веков // Евреи Беларуси: История и культура : Сб. науч. Тр./ Сост. и ред. И.П. Герасимова.-Мн.: Четыре четверти,2001 .-вып.6.-с.51.
6. Абезгаус З.Е. Рабочий класс Беларуссии в нач. XX в. (1900-1913гг).- Мн.: наука и техника, 1977.-с.38.
7. Программа политических партий России. Конец XIX-начало XX вв./ Сост. В.В. Кривенький, Н.Н. Тарасова,-М.: Росспэн,1995,-с.80.

Резюме

Статья посвящена становлению еврейского общественно-политического движения на территории Беларуси в 19-начале 20 века. Автор анализирует основные предпосылки и причины активизации еврейского общественно-политического движения в 19 веке, раскрывает специфику его генезиса в регионе в указанный период.

Summary

The article is devoted to the problem of formation of the Gewish national-political movement on Belorussian region at the end of the 19$^{th}$ century- beginning of the 20$^{th}$ century. Main reasons and preconditions of the activation of the Gewish national-political movement of the 19$^{th}$ century are analyzed by the author as well as the specific character of the political movement genesis in the region during the above period is revealed.

УДК .01.+82.081

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФАКТАР І КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЯ ІСНАСЦЬ У МАСТАЦКАЙ ПРОЗЕ ЯНКІ БРЫЛЯ НА МЯЖЫ XX – XXI СТАГОДДЗЯЎ

**Р.К. Казлоўскі**
УА “Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Тып свядомасці (менталітэт) асобнага народа праяўляецца ў ягонай культурнай традыцыі і ў найбольшай ступені ў мастацкай літаратуры, якая адлюстроўвае рэаліі матэрыяльнага і духоўнага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ